# ВОДЗЫЎ

афіцыйнага апанента Літвіна Аляксея Міхайлавіча
на кандыдацкую дысертацыю Сацукевіча Івана Іванавіча «Урбананімія Мінска (1793–1991 гг.)», прадстаўленую на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя

**Адпаведнасць дысертацыі спецыяльнасці і галіне навукі, па якіх яна прадстаўлена да абароны.**

Змест дысертацыйнага даследавання І. І. Сацукевіча «Урбананімія Мінска (1793–1991 гг.)» адпавядае спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя і галіне гістарычныя навукі ў адпаведнасці з пашпартам спецыяльнасці, зацверджаным ВАК Рэспублікі Беларусь (загад № 180 ад 01.06.2022).

**Актуальнасць тэмы дысертацыі.**

Гісторыя Мінска – гэта неад'емная частка гісторыі дзяржавы і важны кампанент сучаснасці, які патрабуе аб'ектыўнага аналізу і асэнсавання. Сучасныя рэаліі гістарычнай навукі патрабуюць пошуку аб'ектыўных падыходаў і распрацоўкі новых канцэпцый. Тэарэтычная і практычная значнасць праведзенага дысертантам навуковага даследавання па гісторыі ўрбананіміі дадзенага перыяду, калі Мінск пераважную частку знаходзіўся ў складзе Расіййскай імперыі, а затым у складзе савецкай дзяржавы, за выключэннем некалькіх гадоў нямецкай і польскай акупацыі у 1918-1920 гг. І нацысцкай акупацыі 1941-1944 гг., перш за ўсё ў тым, што яна з'яўляецца першай аьагульняючай працай, у якой на падставе шырокага кола крыніц даследвавна пытанне урбананіміі Мінска разглядаемага ў дысертацыі перыяду. Навуковы творчы разгляд ўнутрыгарадскіх назваў Мінска 1793–1991 гг., прычыны і абставіны іх з'яўлення, ці знікнення, безумоўна абумоўлівае яе тэарэтычную і практычную значнасць.

Напрыканцы 1970-х гг. у гуманітарных даследаваннях з'яўляецца новы напрамак – гістарычная ўрбаністыка, якая хутка ператварылася ў спецыяльную гістарычную дысцыпліну і шырока выкарыстоўвае міждысцыплінарны падыход у даследаваннях гарадской прасторы. Урбананімія з'яўляецца неад'емнай часткай урбанізацыйных працэсаў, якія праходзілі ў Мінску ў перыяд, калі яго статус перажыў трансфармацыю ад губернскага горада да сталіцы незалежнай дзяржавы. Даследаванне ўрбананіміі Мінска дапаможа зразумець гармадска-палітычныя і сацыяльна-эканамічныя змены, што адбываліся напрацягу гэтага часу. Адшуканыя і адроджаныя гістарычныя назвы будуць запатрабаваныя ў розных сферах не толькі гістарычнай навукі, але і гарадскога жыцця.

**Ступень навізны вынікаў, якія атрыманы ў дысертацыі, і навуковых палажэнняў, якія выносяцца на абарону.**

У дысертацыі ўпершыню ў айчыннай гістарыяграфіі праводзіцца комплексны аналіз гістарычных назваў горада і паказваецца сувязь паміж урбанонімамі і сацыяльна-эканамічным, рэлігійным і палітычным развіццём

Беларусі. Саіскальнік вызначае спосабы і этапы фарміравання ўрбананіміі Мінска ў 1793–1991 гг. Аўтар дысертацыі выдзяляе найважнейшыя фактары фарміравання ўнутрыгарадскіх назваў у 1793–1991 гг. У даследаванні раскрываюцца прычыны карэнных перамен ва ўрбананімным ландшафце Мінска ў дадзены перыяд, выяўляюцца асноўныя прынцыпы фарміравання ўрбанонімаў, аднаўляюцца і лакалізуюцца дзясяткі страчаных найменняў. Фактычна ў даследаванні створана аснова для адраджэння забытых назваў на сучасным этапе развіцця горада. У канцэнтраваным выглядзе такія падыходы сфармуляваны ў навуковых палажэннях, якія вынесены на абарону. Навуковыя палажэнні сведчаць аб імкненні дысертанта да адпаведнай навізны ў сваім дысертацыйным даследаванні.

**<u>Абгрунтаванасць і дакладнасць вывадаў і рэкамендацый, сфармуляваных у дысертацыі.</u>**

Дысертацыя саіскальніка з’яўляецца самастойна выкананай работай і творчым даследаваннем. План дысертацыйнага даследавання лагічна сканструяваны і адпавядае мэце і задачам тэмы. Абгрунтаванасць і дакладнасць вывадаў дасягаецца крытычным аналізам вялізнага масіва крыніц, у тым ліку выкарыстаннем сведчанняў і меркаванням папярэднікаў.

Метадалагічную аснову даследавання склалі агульнанавуковыя (аналіз і сінтэз) і канкрэтна-гістарычныя (гісторыка-генетычны, гісторыка-тыпалагічны, гісторыка-сістэмны) метады, прынцыпы гістарызму і аб’ектыўнасці, што дазволіла вырашыць пастаўленыя задачы.

Асноўныя палажэнні дысертацыі атрымалі адлюстраванне ў дакладах аўтара на навуковых канферэнцыях: “Рыжскі мір 1921 года ў лёсе беларускага народа (да 100-годдзя заключэння)” (18–19.03.2021 г., РБ, г. Мінск); “Патрыятычнае выхаванне і захаванне гістарычнай памяці ў сістэме вышэйшай адукацыі Беларусі: сучасны стан і перспектывы” (12–13.04.2022 г., РБ, г. Мінск); “Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі (да 955-годдзя горада)” (9–10.09.2022 г., РБ, г. Мінск); кангрэсе гісторыкаў Беларусі “Гістарычная навука Беларусі: асобы, канцэпцыі, дасягненні (да 95-годдзя Інстытута гісторыі НАН Беларусі)” (15–16.10.2024 г., РБ, г. Мінск).

**<u>Навуковая, практычная, эканамічная і сацыяльная значнасць вынікаў дысертацыі з указаннем рэкамендацый па выкарыстанні.</u>**

<u>Навуковая значнасць</u> вынікаў дысертацыі Сацукевіча І. І. заключаецца ў тым, што яны дазваляюць асэнсаваць асаблівасці фарміравання і трансфармацыі ўнутрыгарадскіх назваў Мінска ва ўмовах сацыяльна-эканамічных і грамадска-палітычных змен у 1793–1991 гг. Вынікі працы дысертанта, зробленыя ім высновы, а таксама назапашаныя саіскальнікам факты будуць спрыяць распрацоўцы даследчыкамі іншых напрамкаў гісторыі горада. Напрыклад, пры даследаванні Мінскага антыфашысцкага падполля важна арыентавацца ў тым, як змяніліся назвы гарадскіх вуліц, каб адзначыць сучасную лакалізацыю тагачасных падзей.

<u>Практычная значнасць</u>. Матэрыялы і высновы даследавання могуць быць выкарыстаны для падрыхтоўкі курсаў краязнаўства ў сярэдніх навучальных установах і для напісання абагульняючых работ пра горад

Мінск. Вынікі дысертацыйнага даследавання выкарыстоўваюцца ў адукацыйным працэсе ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт” (акт аб укараненні ад 18 мая 2022 г.).

Эканамічная значнасць. Матэрыялы дысертацыі можна выкарыстаць ў турыстычнай галіне пры распрацоўцы экскурсійных маршрутаў па Мінску, выданні буклетаў, даведнікаў і пуцевадзіцеляў.

Сацыяльная значнасць. Выяўленыя ў дысертацыі гістарычныя назвы могуць быць выкарыстаны для найменавання новых элементаў гарадской інфраструктуры – вуліц, паркаў, станцый метро, мікраараёнаў. Таксама для стварэння камфортнага асяроддзя для жыхароў сталіцы Рэспублікі Беларусь.

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі ў навуковым друку.**

Асноўныя палажэнні і вынікі дысертацыйнага даследавання прадстаўлены ў 44 публікацыях, сярод якіх 8 артыкулаў у навуковых часопісах і зборніках, рэкамендаваных ВАК Рэспублікі Беларусь (4 аўт. арк.), 36 – у іншых навуковых зборніках і матэрыялах канферэнцый. Агульны аб’ём апублікаваных прац складае 16 аўтарскіх аркушаў.

**Адпаведнасць афармлення дысертацыі патрабаванням ВАК.**

Афармленне дысертацыі адпавядае Інструкцыі па афармленні дысертацыі і аўтарэферата ВАК Рэспублікі Беларусь, зацверджанай пастановай ВАК Рэспублікі Беларусь ад 22 жніўня 2022 г. № 5. Прысутнічаюць усе неабходныя структурныя часткі; у дысертацыі ёсць спасылкі на аўтараў і крыніцы, якія былі выкарыстаны саіскальнікам, а таксама на ўласныя публікацыі, у якіх прадстаўлены асноўныя вынікі дысертацыйнага даследавання.

**Заўвагі і пажаданні**

Высока ацэньваючы праведзенную аўтарам працу по выяўленню, сістэматызацыі і навуковаму асэнсаванню надрукаванай айчыннай і замежнай гістарыяграфіі, выяўленных новых архіўных матэрыялаў і іншых дакуменальных крыніц, хацелася б выказаць асобныя заўвагі і пажаданні, якія, на наш погляд, дысертанту неаабходна ўлічыць у далейшай працы над тэмай.

1. У першым абзацы параграфа 1.1. (с. 12) аўтар сцвярджае “**Унутрыгарадскія назвы Мінска ў 1793–1991 гг. дагэтуль не з’яўляліся прадметам спецыяльнага гістарычнага даследавання, хоць гісторыя ўрб-маў шэрагу гарадоў Беларусі і постсавецкай прасторы знайшла сваіх даследчыкаў”**. Далей ён пералічвае аўтараў, якія ў XX – у пач. XXI ст. апублікавалі “ грунтоўныя працы, прысвечаныя гісторыі ўрбананіміі” Брэста, Гомеля, Гродна, Кіева,Масквы, Санкт-Пецярбурга…” [спасылкі 1-8]. Гэты пералік меў бы сэнс, калі б названыя аўтары разглядалі ўрбанімію названных гарадоў перыяду 1794-1991 гг. Для прыкладу праца Ю.Гардзеева прысвеча тапаніміі старажытнай гародні Х11- ХУ111 стст.

“Акрамя таго, - працягвае далей дысертант, - **асобныя аспекты дадзенай праблемы** закраналіся даследчыкамі гісторыі,

архітэктуры, культуры Мінска, а гістарычны аспект урбананімнага ландшафту горада неаднаразова станавіўся аб'ектам вывучэння географаў і філолагаў, якія, працуючы над вырашэннем сваіх навуковых задач, вымушаны былі выходзіць за межы геаграфіі і анамастыкі і адказваць на гістарычныя пытанні". Пры далейшай падрыхтоўцы працы да выдання гэтую старонку патрэбна будзе аўтару перапрацаваць, каб не заблытваць чытача.

1. Агляд гістарыяграфіі і крыніц заўседы патрабуе ад даследчыка значных высілках по збору і асэнсаванню гістарыяграфічных і архіўных крыніц. Асабліва гэта цяжка рабіць тады, калі разглядаецца вялікі храналагічны перыяд і існуе шмат разнастайнай інфармацыі. Таму кожны даследчык для лепшага успрымання вынікаў яго працы выпрацоўвае сваю перыядызацыю вывучэння праблемы, грунтуючыся на разглядзе навуковых даследаванняў і архіўных матэрыялаў, а калі яны адсутнічаюць, ці іх мала, шырока выкарыстоўваюць публіцыстычныя. Пры аналізе гістарыяграфіі ўгутрыгарадскіх назваў Мінска 1793-1991 гг. аўтар правамерна выдзяляе пяць асобных храналагічных этапаў. Першы 1793 – 1917 гг. Першы супадае з часам знаходжання тэрыторыі Беларусі ў складзе Расійскай імперыі і вызначаецца зараджэннем горадазнаўства, апісальнай метадалогіяй у дачыненні да ўнутрыгарадскіх назваў. Менавіта тады былі закладзены асновы навуковага даследавання ўрбананімнай прасторы Мінска. Другі этап гістарыяграфіі супаў з нацыянальна-дзяржаўным будаўніцтвам у Беларусі (1918 – канец 1920-х гг.) і характарызаваўся актывізацыяй краязнаўчага руху ў БССР, з'яўленнем шэрага работ з урбананімным зместам. Трэці этап гістарыяграфіі ўнутрыгарадскіх назваў Мінска ў 1793–1991 гг. ахоплівае 1950–1970-я гг. Чацвёрты этап (1980-я гг.) амаль супадае з апошнім дзесяцігоддзем існавання СССР і вызначаецца значным ростам публікацый і навуковых даследаванняў пра Мінск, а таксама з'яўленнем спецыялізаваных тапанімічных работ. Пяты, сучасны этап гістарыяграфіі гарадской тапаніміі Мінска ахоплівае перыяд ад 1990 г. і да нашага часу і характарызуецца інтэнсіфікацыяй публіцыстычных і навуковых даследаванняў, у тым ліку прысвечаных урбананіміі Мінска.

Пры аглядзе прац чацвертага этапу, дысертант піша, што ў 1984 г. вышла манаграфія З.В. Шыбекі З.В. «Минск в конце XIX – начале XX в.", прысвечаная сацыяльна-эканамічнаму развіццю горада і адзначае, што ў ёй упершыню публікуецца карта Мінска 1905 г. з пазначанымі на ёй вуліцамі. (ст. 17) У спасылцы 43 на 116 ст. год выпуску кнігі 1985. На гэтай старонцы аўтар наступным чынам характарызуе кнігу для вучняў З. С. Пазняка "Рэха даўняга часу" (1985) "Нягледзячы на мастацкую скіраванасць кнігі, для абазначэння архітэктурных помнікаў побач з сучаснымі аўтар упершыню ў гістарыяграфіі выкарыстаў назвы не папярэдняга

перыяду (якія існавалі ў др. пал. XIX – пач. XX ст.), а ранейшыя найменні, якія можна абазначыць як гістарычныя або першапачатковыя. Больш таго, аўтар прапанаваў сваю версію этымалогіі асобных урб-маў Мінска.” Узнікае пытанне – якую?

У адносінах да кнігі У. М. Дзянісава “Площадь Свободы в Минске” (1985) дысертант адзначае, што “аўтар акцэнтуе ўвагу на назвах вуліц вакол галоўнай плошчы Мінска”, у гэтым стылі характарызуецца і артыкул У.М. Дзянісава у часопісе “Неман” “Гісторыю найстарэйшага сквера Мінска – Аляксандраўскага – раскрывае артыкул У. М. Дзянісава “Старый Минск” [с.17].

2. У другой главе дысертацыі саіскальнік, аналізуючы ўрбананімны ландшафт Мінска канца XVIII – пачатку XIX стагоддзя, знаходзячыся відаць пад уплывам публітыстычных матэрыялаў рознага часу, таксама грашыць выкарыстоўваннем апісальнага метаду, што стварае ўражанне не навуковага, а краязнаўчага тэкста. У розных месцах дысертацыі аўтар выкарыстоўвае публіцыстычны стыль у напісанні тэкста работы. Так, на с.31- “час ад часу”, “назва вуліцы падказвае”, на с. 40 ён піша “Тое што існавалі вуліцы з аднолькавымі назвамі, губернатара М. Трубяцкога не бянтэжыла. Такую пазіцыю губернатара можна растлумачыць нежаданнем імперскай улады ісці насустрач грамадскім ініцыятывам.” На с.91, дзе гаворке ідзе аб пераіменаванні вуліц у канцы 80-х аўтар заключае “Гэта вырашыла б адразу дзве праблемы : пазбавіла б горад ад паўторнай назвы і назаўсёды “злучыла” закаханых на карце Мінска”. Выраз безумоўна добры для ўспрымання турыстамі пад час экскурсіі.
3. Не заўсёды можна зразумець вызначэнне сучаснай лакалізацыі “пачатак праспекта Пераможцаў” (с. 47). Больш правільным было б указанне на канкрэтны адрас дадзенай часткі праспекта.
4. У раздзеле 3.2 “Адлюстраванне грамадска-палітычных змен у назвах вуліц і плошчаў у 1923–1944 гг.” разглядаецца ў тым ліку і палітыка нямецка-фашысцкіх захопнікаў у дачыненні да гарадской тапанімікі. Хацелася б больш шырокага паказу ролі нямецкай вайсковай і грамадзянскай адміністрацыі, беларускіх калабарантаў у гэтым пытанні, адлюставанні яго у нямецкамоўных і беларускіх акупацыйных выданнях.

Аднак выказаныя заўвагі не зніжаюць навуковую вартасць праведзенага даследавання, носяць рэкамендацыйны і дыскусійны характар.

**Адпаведнасць (неадпаведнасць) навуковай кваліфікацыі саіскальніка вучонай ступені, на якую ён прэтэндуе.**

Дысертацыйнае даследаванне І. І. Сацукевіча – самастойна выкананая кваліфікацыйная навуковая работа, якая мае ўнутраную логіку і сведчыць аб асабістым укладзе навукоўца ў распрацоўку навуковай праблемы ўрбананіміі Мінска. Навуковая кваліфікацыя І. І. Сацукевіча адпавядае вучонай ступені

кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя.

Дысертацыйнае даследаванне “Урбананімія Мінска (1793–1991 гг.)” адпавядае патрабаванням «Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеней і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь», а яго аўтар – Сацукевіч Іван Іванавіч – заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата гістарычных навук за:

- Выяўленне працэсу раскрыццё спосабаў фарміравання ўрбананімнага ланшафту Мінска ў 1793–1991 гг. – аўтаномнага і інстытуцыянальнага;
- вылучэнне ва ўрбананіміі Мінска ў 1793–1991 гг., у залежнасці ад змен дзяржаўнай прыналежнасці горада і дзяржаўнай палітыкі, а таксама існавання на той час спосабу фарміравання ўрбананімнай прасторы, чатырох этапаў: 1) 1793–1865 гг.; 2) 1866–1916 гг.; 3) 1917–1944 гг.; 4) 1945–1991 гг.;
- вызначэнне важнейшых фактараў фарміравання ўрбананіміі Мінска ў 1793–1991 гг.: сацыяльна-эканамічнага і грамадска-палітычнага;
- выяўленне прынцыпаў фарміравання ўнутрыгарадскіх назваў Мінска ў 1793–1991 гг.: этна-рэлігійнага, тапаграфічнага, геаграфічнага, прафесійнага, геданімічнага, патранімічнага і сімвалічнага;
- вызначэнне гістарычных назваў вуліц, плошчаў, прадмесцяў і ўрочышчаў Мінска, іх этымалогію і лакалізацыю на карце сучаснага горада.

Афіцыйны апанент, доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык цэнтра ваеннай гісторыі Беларусі Дзяржаўнай навуковай установы “Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі” А. М. Літвін

09.06.2025 г.

Подпіс Літвіна А.М. сведчу
Вяд. спецыяліст па кадрах
“09” 06 2025 г.

Дзяржаўная навуковая ўстанова Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі * Рэспубліка Беларусь, г. Мінск